М. Чарот

Чырвонакрылы вяшчун

Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі

М. ЧАРОТ

ЧЫРВОНАКРЫЛЫ ВЯШЧУН

ПОЭМА-ФАНТАЗІЯ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА

МЕНСК—1927

Б.Д.В. № 202. Галоўлітбел № 21459.

1-ая дзярж. друкарня. Заказ № 1:5. У ліку 3.000 экз.

ПАЛЁТ ПЕРШЫ

1

Бэнзыну гаручага пах...
Тр-р-р-а—та-та-тах!
Машына запела.
Па зямлі прабеглі калёсы...
Завярцеўся віхрам пропэлер—
Панёсься!

Панёсься!..

Панёсься!..
Я—селянін,
Лётчык—рабочы...
Крычыць мне: „ня бойся!..“
На аэропляне
Вышай!..

Вышай!..

Вышай!..

— Таварыш лётчык, я не саскочу,—
На зямлю толькі гляну
І можа—
Навекі пакіну.

Ляцець я хачу ў падарожжа,
Каб выведаць шчасьця краіну,
Што бачыў я ў марах...

А чорнае царства—ў пажары
Няхай апранецца,
Дзе высі нябеснай плывун,
Чырвонакрылы вяшчун
Пранясецца!..

Матора вяшчунныя песьні
Хай счуюць, дзе дні ліхалецьця...

Таварыш! Хачу паляцець я
Туды—ў паднябесьсе!
Высока!..
Высока!..
Высока!..

Мы закружыліся
Птушкай чырвонай

Над Беларусьсю
Разбуджанай...
Крыльлі срэбным імгляць
Пералівам!
А над соннай,
Перапуджанай
Закрычу я ў блакітную гладзь:
— З зямлі хто ўзьняўся:
Шчасьлівы!
Шчасьлівы!..

2

Крыльлямі хмары
У высі мы рэжам...
Там не адзначаны межы...
Там воля—ня мара.
Ня хочу быць сокалам...
— Гэй, машыністы!
Ня трэба ўздымацца высока,—
Хачу разглядзець усё чыста
На пакінутай намі зямлі...
Чырвоным туманам—
Глядзі, абляглі
Лясы, балоты і поле...
Бураю плача прастор...
Туды паляцім—заглянем,
На край, дзе няволя,
Дзе рэкі напоўнены потам...
А потым—
Зьлятаем да Сонца і Зор.

3

Паплылі! Паплылі! Паплылі!..
Адарваная частка зямлі—
Беларусь...
Не зямлі я шкадую—
Працоўнага люду...
Я над імі нясуся, нясуся...
І чую
Усюды,
Як шуміць паднявольны лес-бор...
Здаецца,
Ён, магутны,
Вось-вось зварухнецца...
Хвалі Нёмну затопяць прастор...
У чырвані ўсё захліпнецца...
Песьні помсты будуць чутны.
Тады вольная краіна
Будзе рада госьцю-сыну,—

І ад маткі, ад бяздольнай
Дар багаты
З новай хаты
Прыме Нёман,
Нёман вольны!
А пакуль—песьні жалю ня змоўклі.
Пазіраю ў бінокль...
Кружуся раз пяты
Над долам-балотам...
Туман белай коўдрай расьпяты
Начуе.
Хачу я,
Каб загароду калючага дроту
Рука з мазалямі парвала,
Каб згінула зьдзеку навала...
Я веру іх сіле!
Кружыся, лётчык-рабочы!
Хай чырвоныя крыльлі
Дзень новы прарочаць!

4

Рук мільёны узьняты угору —
Крычаць прывітаньне!
Зямля у чырвоным убраньні...
Крывёю заліты разоры...
— Больш не падзелены!
Чуваць на зямлі страляніна...
-- Лётчык, ці спраўна машына?
Мы не падстрэлены,
А дух паднявольных узьнялі,—
Ўсё скончыцца слаўна!
— Машына спраўна,
Можна ляцець цяпер далей!
Замільгаліся крыльлі у высі...
Лётчык гукае: „Дзяржыся!“
Паляцелі!..
На захад! За сонцам!

Зямлі апяразваем цела
Голае
Вогненным колам...
За намі ніхто ня угоніцца.
Мы на кані паветранай коньніцы
Ляцім за сонцам!

5

Над абшарамі Польшчы,
Арол белы ў паветры палошча
Крывавыя когці...
Уніз пазірае ён ласа,
А там сьвежае, цёплае мяса...
Меры няма яго злосьці,
Як пабачыў чырвоныя крыльлі...
— Эх, арол, тваё бясьсільле
Асароміць дзень астатні
Твайго жыцьця!
Што? У бойку хочаш выйсьці
З нашай птушкаю крылатай?
Лепш ня кратай
Ты арла чырвонай масьці,—
Ад яго табе прапасьці...
Прэч са шляху!

І адным магутным махам,—
Галавы яго ня стала...
        На ўвесь край засакатала...
І арол забіты—белы
        Камянём зьляцеў у бяздоньне.
На зямлі крычаць „Пабеда“
    — Лётчык! Сьмела!
                Сьмела!
                    Сьмела!
На чырвоных крыльлях еду!..

6

Ад меж Пазнані
        Да нізін Рура
Рабочыя ходзяць панура...
        Мы сталі кружыцца...
Чырвоную птушку спазналі...
І там—Ур-р-р-а-а-а!
                Народ весяліцца.
        Штандар волі мільгацее,
        Змоўклі лаянкі зладзеяў.
                — На вуліцу!
                — На вуліцу!
Чуваць над пад хмарамі,
        І дым па Нямеччыне
                Курыцца.
Запахла пажарамі...
                Чалавечынай...

Гарматы гручэлі бясконца...
Барабаны бомкалі...
Раптам усё змоўкла.
Збор зазванілі,
І над вызваленай
Сьвяціла Чырвонае Сонца.

7

Пропэлер жалобна сьпявае...
Пад намі Францыя.
— Лётчык! тут загукаць каму мне?—
Ты знаеш: у гэтай краіне
Магілы насыпаны першай Комуне,
А цяпер—
Свабода захована ў ранцы.
Справа пачатая гіне...
Лётчык гаворыць:
— Цела зьнішчылі,
А дух іх магутны вітае...
Пропэлер віхураю сьвішча...
Навальніца...
Чырвонае мора
Абшары наўкол залівае.
Маланка іскрыцца!..

З магіл паўстаюць комунары,
Сыплюць іскры ўлева, ўправа!
Слава паўстаўшым!
Слава!
— Помста! Помста!
Вяшчуну чырвонакрыламу!—
Чуваць пагрозы злыя крыкі.
Чырвоным памостам—
Пажарам вялікім
Свой шлях услалі!
— Лётчык! На поўдзень пахілім,
Дзе нас не чакалі...
У новую часьціну
Сьвету—
У чарнакожых краіну,
Дзе вечнае лета.

8

Над краем
Чарнакожых
Лятаем.
Яны таксама людзі няволі.
Гэтакай птушкі,
Нават пахожай,
Ня бачылі, пэўне, ніколі...
І чырвонай істужкай
Сьцелем мы шлях...
Чарнакожым ня страх!
Іскра ляціць на Алжыр...
Гарыць чарнакожых пустыр...
Замест плачу—песьні, скокі
Разьлягаюцца далёка:
— Нам ня жаль!
Нам ня жаль!

Хай агонь затопіць даль...
Ад Алжыру да Дамары,
Хай прастор схаваюць хмары,
Хай там скачуць готэнтоты...
— Птушка, хто ты?!
— Птушка хто ты?!
А нехта крычыць з Трыполі:
— То вяшчун ўсясьветнай волі!

9

А цяпер над акіянам
Чырвонакрылым баянам
Пранясёмся над выспай
Сьвятой Алёны,
Над магілай Наполеона,
Што век цэлы выспаў...
Можа пачуе ён...
— Гэй, Наполеон!
Вось якім пажарам
Асьвечаны чорныя царствы...
Патугі твае былі дарам
Здабыць над зямлёй уладарства!
Не ўладаеш і выспаю гэтай!
Каб быць пакарыцелем сьвету,
Ня толькі зямлёю трэба ўладаць,
А трэба узьняцца

На сінюю гладзь—
І неба павінна табе пакарацца!
На гэтай чырвонакрылай
Машыне,
Тваю мы спалілі
Айчыну!
Зашумелі матора калёсы...
Няма адгалосу...
Хвалі стагналі глуха..
— Лётчык, слухай!
Ці блізка Калюмбія?
— Відаць горы Анды...
Люблю я
Сіні край Атланты,
Бушуючы яго прастор...
Там вечна бойка хваляў-гор..
Ў ім неба бачу я адбітак...
Узоры вытканыя з зор,
Нібы са злота-срэбных нітак.
Але відаць ужо Чылі...
Над выспай Вогненнай Зямлі...
Матор сакоча...

Сонца паўдзённага бліск
Сьлепіць вочы...
Але ад ветру
Ў паветры
Ня горача...
Мы над зямлёю нізка...
— Лётчык, стрымай машыну,
Хачу запаліць Аргенціну...

10

Калюмбія—край капіталу...
Фабрыкі і заводы
Форда
Гудкамі рагочуць,—
Доляраў мала...
А рабочы
І неба чарнее ад дыму...
Ніхто ня ўздыме
Мураваныя гмахі...
Капіталу сьцяна
Вадою абнесена—
Няма страху...

Але вось вяшчуна
Чырвонакрылага песьні
Зьверху нясуцца...
І больш ня куюцца
Стопудовым молатам

Аружжа, машыны,
Чужымі рукамі, за чужое золата...
    Згіне нявольніцтва, згіне!
            Узьняўся агонь
        Ад Патагоніі
Да самай Аляскі...
— Гэй, магутнейшы Форд!
Зубамі са злосьці паляскай..
Ня будзеш ты ўласьнікам—
Ні фабрык, заводаў, ні гораду...
Даволі ў аўтамабілі
        Па зямлі поўзаць!
Мы панясёмся ў іх горда!
Мы пабядзілі!
Людзей ня купіў усіх—позна!
        Свайго ня выпрашваем—
        Мы пабядзілі!
Наша ўсё! Наша!
        Заводы, аўтамабілі,
            Гарадоў небаскробы...
Магутней няма—н а ш а й с і л ы...
За намі узьняцца папробуй?!.

11

— Лётчык, завінчывай!
Мы над Вялікім...
Ляцім праз Сандвічавы...
Ад неба акіян сінее.
Выспы, выспы бяз ліку,
Новая Гвінея...
Аўстралія...
Перапуджаны колёністы...
Крыльлі пропэлера перасталі
Вярцецца.
Чуць-чуць ніжэй...
Дзікіх нявольнікаў сьвісты...
Спаткалі скокамі.
Іскры мяцеліцай,—
Агонь колёніі ліжа...
Зноў высока мы—
Над Явай над Суматрай...

— Лётчык, варта
Праляцець над жоўтакожымі:
І тут паможам мы
Узьняць паўстаньне...
Загулі над Кітаем...

А вось і краіна тая,
Што выспай чырвонай
У акіяне
Бачу адбітай.
Японія...
Край усходзячага сонца,
Пад пропэлера перазвоны
Быў асьвечан Фузі-Ямай.
Помню я:
Гарады заліты
Выбухам з вогненнай ямы
Гаручага чырвонца...
Край усходзячага сонца—
Сілы падземнай ахвяры...

— Лётчык, зямля ўся ў пажары:
Стары сьвет і новы...

Ляцець трэба зноў,
Скуль падняўся вяшчун—
К блакітнай высі...
Загуло нібы тысяча струн...
— Таварыш, дзяржыся!—
Крыкнуў лётчык-рабочы,—
— Апускацца вось тут на зямлю
Няма як!..
Вачамі даль маўклівую лаўлю
І ў ясны дзень і ў цемру ночы...
— Лётчык! Лётчык!
Бачу чырвоны маяк...
А вось знаёмыя нізіны,—
Крывёю рэкі ўжо ня льлюцца.
Лётчык, завярці машыну—
Хутчэй свабоду прывітаем...
Мы ляцім над краем—
Першай Вялікай Рэволюцыі...

12

О, як прыгожа з вышыні
Акінуць вокам лес і поле...
Дзе сэрца слодыч вып'е болей
Як ні ў бязьмернай вышыні.
А колькі сілы і адвагі
Ты чуеш там—у вышыні...
Няма жыцьця прагненьня—смагі...
Ты—няўміручы ў вышыні.
Плыве, плыве вяшчун крылаты...
Блакітну даль, прастору ніжа.
Разьдзьмухівае хмары ветрам...
На тысячы ўзьняўся мэтраў...
Плыве, плыве вяшчун крылаты
               І раптам—
Ніжай!
               Ніжай!
                              Ніжай!

Замоўк гучлівы сьпеў матора.
Здаецца, рэчкі, поле, хаты,
Увесь абшар—нізіны, горы,—
Плыве ўсё ўвысь, адкуль мы едзем...
Нясуся!
Нясуся!
Нясуся!

— Лётчык! Нагледзім,
Каб там апусьціцца,
Скуль быў узьлёт.

Мы пачалі кружыцца
Над Беларусьсю
Вольнай і Злучанай.
Вяшчун-самалёт,
Ахварбованы
Вечарам рыжым,
Сьпявае гучна,
Лятае чаруючай птушкай...
Ніжай!
Ніжай!
Ніжай!..

Лётчык кіруе на дым,
Што сьцелецца чорнай
Істужкай...
Шугнула полымем
Салома—
Дзе быў уздым!..

— Над полем мы—
Аэродромам...
Прыемны ахапляе страх...
Матор галосіць...

Нізка!
Нізка!
Нізка!

Гаручы бэнзын бліскае!
Тр-р-ра—та—та—тах!..
Зямлю цалавалі калёсы..
— Таварыш лётчык! Як прыгожа
Ляцець было ў блакітнай высі,
Калі вяшчун за хмарай віўся
І шлях шукаў для падарожжа!

Што тут мяне уцешыць зможа?
Вайна, пажар? Зямля і людзі?..
Увысь імкнуцца вечна будзе,
Хто быў у гэткім падарожжы!..

1922 г. Менск.